эти процедуры. В вопросе водоснабжения ярко проявилась тенденция приспосабливаться к бытовым неудобствам. Повседневные практики горожан оказались очень пластичными и гибкими на фоне распространённых недостатков в работе критически важного элемента городского коммунального хозяйства.

**Библиографический список**

1. Бон Т. «Мінскі феномен». Гарадское планаванне і ўрбанізацыя ў Савецкім Саюзе пасля 1945 г. Мінск: Зміцер Колас, 2016.
2. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Оп. 29. Д. 12.
3. Лынькоў М. Збор твораў у 8 тамах. Т. 8. Мінск: Навука і тэхніка, 1985.
4. Якуб Колас. Збор твораў у 20 тамах. Т. 19. Мінск: Беларуская навука, 2012.
5. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 35. Д. 142.
6. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 42. Д. 28.
7. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 51. Д. 62.
8. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 50. Д. 48.
9. НАРБ. Ф. 7. Оп. 3. Д. 1843.
10. Автозаводец. № 43 (102). 1948. 1 июля.
11. НАРБ. Ф. 265. Оп. 5. Д. 125.
12. НАРБ. Ф. 7. Оп. 3. Д. 1408.
13. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 81. Д. 342.
14. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 35. Д. 107.
15. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 35. Д. 144.
16. НАРБ. Ф. 205. Оп. 5. Д. 1566.
17. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 65. Д. 104.
18. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 35. Д. 221.
19. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 47. Д. 199.
20. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 47. Д. 174.
21. Макаёнак А. Збор твораў у 5 тамах. Т. 5. Мінск: Мастацкая літаратура, 1990.
22. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 38. Д. 340.
23. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 29. Д. 28.

# АДЛЮСТРАВАННЕ ЭКАНАМІЧНЫХ, ПАЛІТЫЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВІН У ГАЗЕЦЕ «ЧЫРВОНЫ СЦЯГ» (МАЛАДЗЕЧАНСКІ РАЁН) ЗА 1953 г.

***А. А. Мядзведзева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, his. medvedevAA@bsu.by*

Сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць вялікую ролю ў фармаванні меркавання і светаўспрымання чалавека, які іх вывучае, а таксама маюць вялікі ўплыў на фармаванне пазіцыі чалавека ў грамадстве. І. В. Сталін казаў, што «Друк – гэта наймацнейшая зброя, пры дапамозе якой партыя штодзённа, штогадова размаўляе з рабочым класам на сваёй, патрэбнай ёй мове». Газета «Чырвоны сцяг» – раённая газета Маладзечанскай вобласці. Яна з’яўлялася органам Маладзечанскага райкома КПБ і Раённага савета дэпутатаў працоўных. Мэта артыкула – аналіз эканамічных, палітычных і сацыяльных навін газеты «Чырвоны сцяг» за 1953 год. У ім разглядаюцца актуальныя

тэмы і яскравыя падзеі 1953 года, ацэньваецца характар выкладання матэрыяла і ступень ідэалагічнага ўплыву СМІ на насельніцтва, разглядаюцца эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя навіны, адлюстраваныя ў газеце, у сукупнасці і асобна.

***Ключавыя словы:*** газета «Чырвоны сцяг»; Маладзечанскі раён; эканамічныя навіны; палітычныя навіны; сацыяльныя навіны.

# ОТРАЖЕНИЕ ЭКОНОМИЧЕСКИХ, ПОЛИТИЧЕСКИХ И СОЦИАЛЬНЫХ НОВОСТЕЙ В ГАЗЕТЕ «КРАСНОЕ ЗНАМЯ» (МОЛОДЕЧНЕНСКИЙ РАЙОН) ЗА 1953 г.

***А. А. Медведева***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, his. medvedevAA@bsu.by*

Средства массовой информации играют большую роль в формировании мировоззрения изучающего их человека, а также оказывают большое влияние на формирование позиции человека в обществе. И. В. Сталин говорил, что «печать есть сильнейшее оружие, с помощью которого партия ежедневно, каждый год общается с рабочим классом на своем, понятном языке». Газета «Красное Знамя» — районная газета Молодечненского района. Она являлась органом Молодечненского районного комитета Коммунистической партии Беларуси и районного Совета рабочих депутатов. Цель статьи – анализ экономических, политических и социальных новостей газеты «Красное знамя» за 1953 год. В статье рассматриваются актуальные темы и яркие события 1953 года, оценивается характер предоставления материала и степень идеологического влияния средств массовой информации на население, рассматриваются экономические, политические и социальные новости, отраженные в газете, в целом и по отдельности.

***Ключевые слова:*** газета «Красное Знамя»; Молодечненский район; экономические новости; политические новости; социальные новости, 1953 год.

# REFLECTION OF ECONOMIC, POLITICAL AND SOCIAL NEWS IN THE NEWSPAPER «KRASNOE ZNAMYA» (MOLODECHNO DISTRICT) IN 1953

***A. A. Medvedeva***

*Belarusian State University, Nezalezhnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. A. Medvedeva (his. medvedevAA@bsu.by)*

The mass media play an important role in shaping the worldview of the person studying them, and also have a great influence on the formation of a person's position in society. I. V. Stalin said that «the press is the strongest weapon with which the party communicates with the working class every day, every year in its own, understandable language». The newspaper «Krasnoe Znamya» is the regional newspaper of the Molodechno district. It was the organ of the Molodechno District Committee of the Communist Party of Belarus and the District Council of Workers' Deputies. The purpose of the article is to analyze the economic, political and social news of the newspaper «Krasnoe Znamya» for 1953. The report examines current topics and vivid events of 1953, assesses the nature of the material and the degree of ideological influence of the mass media on the population, examines the economic, political and social news reflected in the newspaper, as a whole and separately.

***Keywords:*** newspaper «Krasnoe Znamya», Molodechno district, economic news, political news, social news, 1953.

Сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць значную роль у фарміраванні меркавання і светаўспрымання чалавека, які іх вывучае, а таксама маюць вялікі ўплыў на фарміраванне пазіцыі чалавека. І. В. Сталін казаў, што «Друк – гэта наймацнейшая зброя, пры дапамозе якой партыя штодзённа, штогадова размаўляе з рабочым класам на сваёй, патрэбнай ёй мове» [3, с. 1].

У сярэдзіне XX ст. ў заходніх абласцях БССР асноўнымі крыніцамі інфармацыі з'яўляліся газеты, радыё, розныя вусныя спосабы перадачы інфармацыі. Але самым эфектыўным сродкам сталі газеты. Газет было даволі шмат, яны выходзілі ў розных сферах і публікавалі актуальныя навіны. Адной з асноўных газет Маладзечанскага раёна ў 1950-я гг. з’яўлялася газета «Чырвоны сцяг» – орган Маладзечанскага райкама Камуністычнай партыі Беларусі і Раённага Савета дэпутатаў працоўных.

«Чырвоны сцяг» – гэта раённая газета, якая, на думку савецкага кіраўніцтва, павінна даступна і сістэматызавана тлумачыць палітыку партыі і Савецкага ўрада, павышаць узровень камуністычнай свядомасці мас, а таксама рашуча змагацца з перажыткамі капіталізму ў свядомасці людзей [3, с. 1]. Газета выходзіла пад агульным дэвізам «*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!»,* што з’яўляецца адным з лозунгаў камуністычнай партыі. Публікаваліся навіны ў розных сферах: эканамічнай, палітычнай сацыяльнай. Эканамічная сфера была адной з вядучых для заходніх абласцей БССР. У 1953 г. завершыўся другі этап калектывізацыі, і больш за 90% сялянскіх гаспадарак было калектывізавана. Кіраўніцтва СССР ставіла новую мэту: паляпшэнне працы калгасаў, павышэнне прадуктыўнасці сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі, атрыманне як мага большага прыбытку з калгасаў і саўгасаў [1, с. 130–131].

У газеце «Чырвоны сцяг» публікавалі разнастайныя эканамічныя навіны. Справаздачы афіцыйных органаў улады ў галіне эканомікі за нейкі перыяд адлюстроўвалі, што ўжо зроблена, ставілі мэты на будучыню, расказвалі пра поспехі. Напрыклад, у нумары за 5 лютага 1953 г. паведамлялася, што ў гэтым годзе калгасы рэспублікі пашырылі пасеўныя плошчы на 6% і павялічылі плошчы, занятыя пасевамі кармавых культур, на 27% [2, с. 1].

Справаздачы аб поспехах калгасаў, брыгад механізатараў, МТС і артыкулы пра стаханаўцаў паказвалі, як патрэбна працаваць і на каго раўняцца. Напрыклад, артыкулы «Выканалі план сенанарыхтовак» і

«Закладваюць сілас» ад 9 ліпеня 1953 г. расказвалі пра поспехі асобных сельгасарцелеў у сенаўборачных работах і закладанні сіласу [7, с. 1], а ў артыкуле «Поспехі механізатараў» ад 29. 10. 1953 г. гаворка вялася пра механізатараў Маладзечанскай МТС, якія неслі стаханаўскую вахту з нагоды 36-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцы і лепшы з іх – Віктар Карней. Ён працаваў на трактары ХТЗ №18 і ўзараў больш за 250 га, замест нормы 141 га [10, с. 1].

Таксама друкаваліся артыкулы-стымулы, якія прапаноўвалі план дзеянняў і прапісвалі актуальнасць і патрэбнасць яго выканання («Узорна рыхтавацца да вясновай сяўбы» – ад 08. 01. 1953 г.), і артыкулы, якія расказвалі пра ільготы і дадатковую аплату, калі будзе добра выканан план (напрыклад артыкул «Дадатковая аплата за захаванне маладняку» ад 07. 07. 1953 г. распавядаў чытачам пра заслугі калгасніц, якія працавалі на фермах) [8, с. 1].

Інфармацыя прадстаўлена з розных галін эканомікі: ад сельскай гаспадаркі да прамысловасці. Паказаны не толькі статыстычныя факты, але і гісторыі з жыцця асобных людзей. Усё гэта мела моцны прапагандысцкі ўплыў, бо людзі бачылі поспехі іншых, параўноўвалі свае дасягненні і ставілі мэту зрабіць больш і таксама атрымаць грошы, славу, трапіць на старонкі газет.

Палітычныя навіны таксама прадстаўлены даволі шырока: ад паведамленняў, якія закраналі увесь СССР, да артыкулаў, прысвечаных Маладзечанскаму раёну. У большасці сваёй агульнасаюзныя навіны тычыліся рэзанансных падзей (смерць Сталіна, партыйныя з’езды, пленумы, гучныя судзебныя справы), а навіны па Маладзечанскаму раёну – выбары ў мясцовыя Саветы, правядзенне мясцовых партыйных форумаў і г. д. У першыя месяцы года звычайна публікаваліся навіны, звязаныя з выбарамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных, а таксама артыкулы пра ход выбарчай кампаніі, пра кандыдатаў у дэпутаты, масава-палітычную работу з насельніцтвам і г. д. Напрыклад, у артыкуле ад 05. 02. 1953 г. распавядалася пра вылучэнне кандыдата ў дэпутаты мясцовага Савета у арцелі імя Пушкіна Вялікасельскага сельсавета [2, с. 2].

Асобнае месца ў партыйна-палітычных навінах займала рубрыка «Партыйнае жыццё», дзе адлюстроўваліся мясцовыя навіны, расказвалася пра поспехі і хібы. Напрыклад, у нумары ад 07. 06. 1953 г. абазначаўся запрос Лебедзеўскага сельсавета аб неабходнасці большай колькасці лекцый, бо ў дадзеным сельсавеце іх чыталі рэдка, а лектарская група існуе толькі на паперы [6; с. 1].

Адной са значных палітычных падзей 1953 г. стала хвароба і смерць І. В. Сталіна. І шэраг артыкулаў нумара ад 15 сакавіка 1953 г. заклікаў насельніцтва СССР цясней згуртавацца вакол ЦК партыі і Савецкага ўрада [4, с. 1]. Артыкулы мелі мэту абгрунтаваць палітычныя дзеянні партыі і даказаць народу, што іх падзяляе большасць людзей краіны. Напрыклад, у комплексе артыкулаў пра прыгавор Вярхоўнага Суда СССР аб расстрэле Берыі, Кабулава, Мяркулава і іншых перадаваліся словы і думкі людзей, якія адабралі гэты прыгавор [11, с. 2].

Навіны ў галіне адукацыі былі актуальнымі заўседы. Тут можна выдзяліць некалькі накірункаў. Першы – гэта рубрыка «Падрыхтоўка школ да новага навучальнага года», якая існавала з ліпеня па кастрычнік і расказвала пра падрыхтоўку навучальных устаноў да новага навучальнага года [7, с. 1]. Другі – агітацыя насельніцтва да ўсеагульнага навучання. Напрыклад, у артыкуле «Усе дзеці школьнага ўзросту павінны вучыцца» расказвалася пра поспехі і няўдачы распаўсюджвання дадзенай думкі сярод насельніцтва раёна [10, с. 2]. Матэрыялы газеты як правіла дапаўняліся фотаздымкамі, што дапамага фарміраваць у насельніцтва прадстаўленне аб значнасці дасягненняў краіны.

Адной з цікавых сацыяльных рубрык – «Па слядах нашых выступленняў». У ёй публікаваліся каментары кіраўнікоў, якім перадаваліся пісьмы для разгляду і рэагавання. Праца з пісьмамі чытачоў, якая адлюстроўвалася на старонках газеты, давала ўпэўненасць, што пытанні вырашаюцца, што газета – адзін з гарантаў дабрабыту і надзейнасці.

Можна казаць, што газета паслядоўна з розных бакоў абгрунтоўвала дзеянні партыі і адначасова гарманічна адлюстроўвала ўсе аспекты жыцця насельніцтва, ставіла мэту выхавання чалавека з сацыялістычнымі поглядамі.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Смяховіч М. У. Калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР (1946–1951 гг.) // Гістарычна-археалагічны зборнік Мінск: Беларуская навука, 2016. С. 128–133.
2. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 05. 02. 1953. №11 (1178). С. 2
3. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 05. 03. 1953. №1 9 (1186). С. 2
4. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 15. 03. 1953. № 24 (1190). С. 2
5. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 10. 05. 1953. № 37 (1204). С. 2

6. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 07. 06. 1953. № 45 (1212). С. 2
7. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 09. 07. 1953. № 54 (1221) . С. 2
8. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 06. 08. 1953. № 62 (1229). С. 2.
9. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 04. 10. 1953. № 79 (1246). С. 2.
10. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 29. 10. 1953. № 86 (1253). С. 2.
11. Чырвоны сцяг: Орган Маладзечанскага РК КП Беларусі і райсавета. 27. 12. 1953. № 103 (1270). С. 2.

# ПОЛЕВАЯ ЭТНОЛОГИЯ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

***Т. А. Новогродский***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, tadeush_minsk@mail.ru*

В статье показана роль полевых этнографических исследований на современном этапе в Республике Беларусь, отмечен вклад академических и вузовских этнологов в организацию и проведение этнографических исследований, подчеркивается важность сбора фактического этнографического материала во всех историко-этнографических регионах Беларуси и использование результатов экспедиций при изучений актуальных научных проблем современной белорусской этнологии.

***Ключевые слова:*** полевая этнология; методы полевых этнографических исследований; этнографические экспедиции; кафедра этнологии, музеологии и истории искусств; традиционная культура.

# FIELD ETHNOLOGY AT THE PRESENT STAGE IN THE REPUBLIC OF BELARUS

***T. A. Novogrodsky***

*Belarusian State University, Nezalezhnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, tadeush_minsk@mail.ru*

The article shows the role of field ethnographic research at the present stage in the Republic of Belarus, notes the contribution of academic and university ethnologists to the organization and conduct of ethnographic research, emphasizes the importance of collecting factual ethnographic material in all historical and ethnographic regions of Belarus and using the results of expeditions in the study of topical scientific problems of modern Belarusian ethnology.

***Keywords:*** field ethnology; methods of field ethnographic research; ethnographic expeditions; department of ethnology; museology and art history; traditional culture.

Полевая этнология является составной частью этнологической науки. Она включает методы и приемы работы в этнографической экспедиции. С